www.nv-online.info

№ 12 (3855)

14 лютага 2014 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец: УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!

Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

БЛІЦ

Не раз сам Аляксандр Лукашэнка ўскосна даваў зразумець, што падчас выбараў у нас сапраўды мела месца фальсіфікацыя галасоў. Шырокая грамадскасць лічыць, што гэта адбываецца з-за непразрыстасці некаторых працэдур, звязаных, напрыклад, з датэрміновым галасаваннем і падлікам вынікаў волевыяўлення. Ні для каго не сакрэт: нават сябры выбарчых камісій не заўсёды ведаюць рэальныя лічбы, таму што ў абсалютнай большасці кожны з іх аўтаномна праглядае пэўны стос бюлетэняў і свае лічбы без агалошвання перадае на паперцы старшыні камісіі, які арганізуе падлік бюлетэняў і галасоў такім чынам, каб з-за спін сябраў камісіі і значнай адлегласці назіральнікі фактычна не маглі кантраляваць іх дзеянні.

“Народная Воля” звярнулася да шэрагу старшынь толькі што сфарміраваных выбарчых камісій з пашыраным, абагульняючым пытаннем:

Падчас выбараў у мясцовыя Саветы падлік галасоў на вашым участку будзе празрыстым, публічным, з агалошваннем вынікаў па кожным стосе бюлетэняў ці па-ранейшаму безгалосным, праз перадачу паперак старшыні камісіі, з фактычным адхіленнем назіральнікаў ад сапраўднага кантролю?

Вольга ШУЛЬГА, старшыня ўчастковай выбарчай камісіі ўчастка для галасавання №20 (Крупскі раён):

— Пасля таго, як прагаласуе апошні выбаршчык, мы зачынім участак і пачнём падлік галасоў: колькі сапсаваных бюллетэняў, колькі галасоў аддадзена “за” ці “супраць” кожнага кандыдата, колькі чалавек прагаласавала “супраць усіх”. Гэтыя вынікі аб’явім сябрам камісіі, а потым ужо будзем запаўняць пратаколы.

Што тычыцца назіральнікаў, то яны маюць права прысутнічаць і могуць назіраць з боку — адзінае, яны не павінны замінаць нашай працы. А глядзець — калі ласка, ніхто не забараняе...

Вольга КАРПОВІЧ, старшыня ўчастковай выбарчай камісіі Гагарынскага ўчастка для галасавання №2 (г.Клецк Мінскай вобласці):

— На падліку галасоў будуць прысутнічаць усе члены нашай камісіі, і вядома ж, усё будзе адбывацца празрыста. Я, дарэчы, першы раз у ролі старшыні камісіі, але мой намеснік, сакратар камісіі — людзі вопытныя, не раз ужо ўваходзілі ў склад участковай камісіі, таму я магу разлічваць на іх дапамогу. Літаратуру неабходную мне ўжо далі, яшчэ будзе праводзіцца вучоба для старшынь участковых камісій. Але пакуль у мяне пытанняў няма, усё зразумела.

Ала ПАЛЯКОВА, старшыня ўчастковай выбарчай камісіі Драздовіцкага ўчастка для галасавання №2 (г.Маладзечна):

— У нас будзе адкрыты падлік галасоў — згодна з выбарчым заканадаўствам. Назіральнікі змогуць бачыць гэты падлік. Калі выкладваюцца стосы бюлетэняў, там жа і так бачна, за каго больш актыўна прагаласавалі людзі. Я сама працую ў тэатры, па-за палітыкай, няўжо буду нешта падтасоўваць? Магу згадзіцца, што могуць быць нейкія недапрацоўкі па адной паперцы, але не ўяўляю, як можна падмяніць сотні бюлетэняў. Так што на адкрытых выбарчых участках усё адкрыта. Паверце, калі нейкія нюансы і з’яўляюцца, то не на стадыі ўчастковых камісій. А за сваю работу я адказваю.

Вольга ШЧАЎКУНОВА, старшыня ўчастковай выбарчай камісіі Ленінскага ўчастка для галасавання №1 (г.Быхаў Магілёўскай вобласці):

— Я не першы год узначальваю выбарчую камісію, нас заўжды вучылі, як трэба праводзіць падлік галасоў. Пытанняў тут ніколі не было. Усе вынікі падлікаў аб’яўляюцца гучна, у прысутнасці назіральнікаў. Пасля спісы вывешваюцца ў агульнадасяжныя месцы, каб любы выбаршчык мог прыйсці і паглядзець, як прайшло галасаванне.

Галіна ДАДАЛЕВА, старшыня ўчастковай выбарчай камісіі Савецкага ўчастка для галасавання №2 (г.Крычаў Магілёўскай вобласці):

— Вось як у нас на ўчастку адбываецца падлік. Датэрміновае галасаванне — сябры камісіі склалі ўсе бюлетэні па стосах: гэты за Краўцова, гэты за Іванова і гэтак далей. Падлічылі, запісалі. Потым адчыняем урны галасавання на даму. Падлічылі. Ну а затым займаемся скрынямі асноўнага галасавання. Лічым галасы, падсумоўваем. Перад гэтым пагашаем усе нявыкарыстаныя бюлетэні. На маім участку заўжды ёсць назіральнікі, нават прадстаўнікі АБСЕ суправаджалі, бо ў нас цэнтральны ўчастак. Пакуль ніякіх нюансаў не было. Вы таксама можаце прыехаць і паглядзець, як у нас галасуюць.

Уладзімір КУШНЕР, старшыня ўчастковай выбарчай камісіі ўчастка для галасавання №28 (г.Крупкі Мінскай вобласці):

— Гарантую: падлік галасоў будзе празрыстым і публічным. На нашым участку заўсёды да канца прысутнічаюць назіральнікі, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі. У нас месца для працы невялікае, але адкрытае, і добра відаць, што і як робяць члены камісіі...

Вольга ЛЯСНЕЎСКАЯ, старшыня ўчастковай выбарчай камісіі №5 (г.Браслаў Віцебскай вобласці):

— Не думаю, што сёлета мы нешта будзем рабіць новае. Усё будзе, як звычайна. Пускаць назіральнікаў да падліку галасоў? Нешта я не памятаю, каб такое было. Ніякіх эксперыментаў на гэтую тэму мы рабіць не будзем і цяпер. Навошта? І так усё робіцца згодна з дзеючым заканадаўствам. Як там указана, так і будзем рабіць... Ды мы пакуль пра гэта і не думалі ўвогуле. Нават не ведаю, што і адказаць вам.

Войцех ГАЛЬЧЭЎСКІ, старшыня ўчастковай выбарчай камісіі №3 (г.Докшыцы Віцебскай вобласці):

— Ну, ёсць жа вызначаны парадак. У адпаведнасці з гэтым парадкам летась у нас былі назіральнікі. Яны сядзелі на адлегласці недзе тры метры. Ну не вісець жа ім на спінах нашых. Калі б яны стаялі побач, то заміналі б нам лічыць. Ну, хочуць сесці бліжэй, дык мы іх пасадзім бліжэй. І гэтага хопіць. Няхай сабе назіраюць. Пасля кожнага падліку мы абвяшчаем вынікі...

Назіральнікі знаходзяцца з намі ў адным пакоі. Ёсць жа парадак. Навошта нам іх дапускаць да стала?

Ад рэдакцыі

*Калі не ўсе, дык многія з чытачоў “Народнай Волі”, безумоўна, чулі пра дэвіз генералісімуса Франка: **“Сваім — усё, ворагам — закон”.** Таму спасылкі шаноўных старшынь камісій на закон нікога не павінны ўводзіць у зман. У законе не прапісана і не можа быць прапісана, на якой адлегласці ад сталоў, за якімі падлічваюцца бюлетэні, павінны знаходзіцца назіральнікі. Як не прапісана і тое, што члены камісій не маюць права падчас падліку закрывацца ад назіральнікаў вазонамі з пальмамі ці “бараніць” бюлетэні ад чужога вока сваімі мажнымі постацямі. Звярніце ўвагу: ніхто з апытаных не сказаў, што падобнага на гэты раз не будзе. Ніхто не сказаў і пра тое, што дазволяць назіральнікам пераправяраць правільнасць афіцыйнага падліку. Ніхто з апытаных не запэўніў, што кожны член камісіі будзе агучваць свае лічбы, а не толькі пісаць іх на паперцы і перадаваць старшыні камісіі. Калі такога не будзе, то, адкрыта скажам, ад праўладных старшынь камісій можна ўсяго чакаць. Якія лічбы “спусцяць” яму зверху, такія ён і агучыць. Але ж да сапраўднай дэмакратыі гэта не будзе мець ніякага дачынення.*

І яшчэ. Ніхто з інтэрв’юіруемых не сказаў, што не будзе выкарыстоўвацца практыка прымусовага датэрміновага галасавання. А якія будуюць урны? Ці ўсё зробяць яны, старшыні камісій, для таго, каб ніякія сілы не змаглі здзейсніць “крымінальны” ўкід бюлетэняў ці іх замену?

На жаль, на гэтыя і многія іншыя пытанні нашы суразмоўцы не адказалі.

(Працяг тэмы на 2-й стар.)

БЕЛАРУСЬ—ЕС

Майра МОРА: «Я настроена аптымістычна»

Кіраўнік прадстаўніцтва ЕС у Беларусі лічыць, што пагадненні аб спрашчэнні візавага рэжыму і рэадмісіі паміж Еўрасаюзам і Беларуссю могуць быць падрыхтаваны да канца гэтага года.

“Перамовы толькі пачаліся, — сказала Майра Мора ў інтэрв’ю БелаПАН. — *Была першая сустрэча ў Брусэлі, куды ездзіла намеснік кіраўніка беларускага МЗС **Алена Купчына**. Наколькі мне вядома, наступная сустрэча плануецца на сакавік. Трэба разумець, што гэта даволі працяглы працэс. Але і з боку ЕС, і з беларускага боку ёсць жаданне прыйсці да выніку. Я настроена аптымістычна”.*

Мора таксама адзначыла, што пасля складання візавага пагаднення для беларусаў будзе зніжаны кошт шэнгенскіх віз. Як вядома, пагадненні аб спрашчэнні візавага рэжыму з ЕС ужо падпісаны з усімі краінамі “Усходняга партнёрства” і Расіяй. На гэты момант Беларусь — адзіная краіна “Усходняга партнёрства”, грамадзяне якой вымушаны плаціць за шэнгенскую візу не 35, а 60 еўра.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Пакінулі пад наглядам

Суд Першамайскага раёна Мінска працягнуў на тры месяцы прэвентыўны нагляд у дачыненні да сустаршыні зарэгістраванага ў Чэхіі “Маладога фронту” Зміцера Дашкевіча.

Нагляд над Дашкевічам, устаноўлены на паўгода, павінен быў скончыцца 28 лютага. Зараз ён працягнуты да 28 мая.

Сам сустаршыня “Маладога фронту” на судзе не прысутнічаў, бо быў заняты на працы.

ПАМЯЦЬ

Ці падтрымае грамадства абаронцаў Курапатаў?

Абаронцы мемарыяльнага комплексу “Курапаты” лічаць, што 2014 год можа стаць самым небяспечным у справе захавання гісторыка-культурнага помніка. Прадухіліць забудову на парэштках расстраляных падчас сталінізму людзей прадстаўнікі дэмакратычнай супольнасці маюць намер праз суд.

Адказчыкам у судзе будзе Міністэрства культуры, бо менавіта яно дало дазвол на будаўніцтва скандальна вядомага “Бульбаш-хола”, а таксама катэджнага мікраяёна “Сонечны”. У якасці істца можа выступіць група грамадзян альбо нейкая грамадская арганізацыя.

На сённяшні дзень “Курапаты” — адзіны ў Еўропе мемарыял масавага знішчэння людзей у часы сталінізму, да стварэння якога дзяржава ніякім чынам не спрычынілася. Усё было зроблена рукамі грамадзян. Тут неаднаразова фіксаваліся выпадкі вандалізму — невядомыя пілавалі крыжы, насілі свастыку, рушылі так званую “лаву Клінтана”, выкопвалі парэшткі нябожчыкаў, але афіцыйныя асобы ўпарта робяць выгляд, што праблемы не існуе.

Між тым сёлета споўніцца 25 гадоў пастанове Савета міністраў па стварэнні мемарыяла ва ўрочышчы Курапаты. Пастанову дагэтуль так і не выканалі. Гісторык **Ігар Кузняцоў** на гадавіну пастановы прапанаваў правесці грамадскі трыбунал. Нагадаем, што дагэтуль ніводная былая савецкая рэспубліка так і не правяла падобны “суд” над злачынствамі сталінізму. Праўда, у 2001 годзе трыбунал адбыўся ў Літве, але ён быў не нацыянальны, а міжнародны.

У рамках кампаніі распачынаецца падрыхтоўка “Чорнай кнігі сталінізму. Беларусь: злачынствы, тэрор, рэпрэсіі”. Кніга стане, на думку Кузняцова, галоўным абвінаваўчым заключэннем. Праект мае агульнанацыянальны характар — усе жадаючыя могуць дасылаць свае гісторыі і ўспаміны. Можна будзе азнаёміцца з дакументамі, фатаграфіямі, аўдыё- і відэаматэрыяламі, а таксама інтэрактыўнай картай месцаў масавага пахавання ахвяр палітычных рэпрэсій. Спачатку кніга будзе існаваць у электронным выглядзе, а потым яе надрукуюць.

Любоў ЛУНЁВА.

Да ведама

У ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года ў мінскай турме НКУС было расстраляна больш за сотню прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі. КДБ Беларусі ў 1993 годзе заявіў, што з 1917-га па 1950-я гады ў Беларусі было рэпрэсавана каля 600 тысяч чалавек. Расстраляна — каля 35 тысяч.

Ігар Кузняцоў называе іншую лічбу — 1,6—1,7 мільёна чалавек, а колькасць расстраляных — каля 370 тысяч.

КРЫМІНАЛ

Магілёўскага банкіра затрымалі ў Расіі

Чатыры гады работніка магілёўскага банка адшуквалі праз Інтэрпол.

Працуючы ў 2010 годзе ў аддзеле абслугоўвання юрыдычных асоб, ён па безнаяўным разліку перавёў на сваю картку 1 млрд 300 млн рублёў. Напярэдадзе былі тры выхадныя дні, што дало яму магчымасць выйграць час і паздымаць грошы з усіх банкаматаў горада. Іх ён памяняў на валюту і схаваўся.

Толькі нядаўна рабаўніка ўдалося затрымаць у Расіі, у горадзе Ліпецку. У затрыманага былі дакументы на іншае імя.

АНОНС



Яго радавод...

*Вядомы беларускі вучоны, адзін з самых аўтарытэтных даследчыкаў мінулага Бацькаўшчыны, доктар гістарычных навук, прафесар **Анатоль Грыцкевіч** нядаўна прымаў шматлікія віншаванні з 85-гадовым юбілеем. Даўняга сябра газеты шчыра віншуем і мы, народавольцы.*

У наступным нумары ў рубрыцы “Сустрэчы” будзе апублікавана гутарка са знаным навукоўцам і цудоўным чалавекам. Анатоль Пятровіч раскажа пра сваё радаводнае дрэва, падзеліцца думкамі і марамі (так, і марамі!), пазнаёміць з новым рукапісам...

Даша — золата наша!



Біятланістка Даша Домрачава заваявала для Беларусі на Алімпіядзе ў Сочы першы залаты медаль! Яе выступленне падчас гонкі праследавання было настолькі прыгожым і захапляльным, што нагадвала песню. Песню перамогі!

Сёння Дар’я Домрачава выступіць у індывідуальнай гонцы. І тут, як кажуць, без каментарыяў. Будзем проста балець...

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Маці Дар’і Домрачавай: *«Я прадчувала, што будзе перамога...»*

Калі чатыры гады таму на Гульнях у Ванкуверы Даша ўзяла алімпійскую “бронзу”, у мінскім аэрапорце яе сустракала мама. Ларыса Аляксееўна трымала ў руках букет цюльпанаў, вочы поўніліся слязьмі шчасця, і яна радасна распавядала журналістам, як будзе частаваць дачку фірмовым макавым торцікам: *“Гэта “каронка” нашай сям’і, такі торт гатуецца толькі на самыя галоўныя святы”.*

Зараз Ларысе Аляксееўне давядзецца частаваць ужо алімпійскую чэмпіёнку...

— Віншаванні, віншаванні, тэлефон проста разрываецца, — распавяла “Народнай Волі” шчаслівая мама спартсменкі. — Але гэта прыемныя турботы.

— З Дашай вы пастаянна на сувязі?

— У дзень перамогі даслала ёй sms-ку, а яна ўжо затым сама патэлефанавала, калі праходзіла допінг-кантроль. А пасля гэтага і не турбую, бо ў яе пачалася падрыхтоўка да новых стартаў, а лішнія эмоцыі нікому не патрэбны.



— Можа, было нейкае мацярынскае прадчуванне, што дачка заваюе “золата” Алімпіяды?

— Яшчэ з раніцы. І казалі мы ў сям’і так: “Яна — лепшая. Яна — першая. Яна пераможа”. Усё так і атрымалася.

— Даша — прымхлівы чалавек? Можа быць, ёсць нейкія прыкметы, у якія яна верыць напярэдадні такіх адказных спаборніцтваў?

— На мой погляд, не вельмі прымхлівая. Яна заўсёды спадзявалася толькі на свае сілы.

— Чым будзеце частаваць алімпійскую чэмпіёнку? Ізноў згатуеце макавы торт?

— Нешта прыдумаем... Ды і Алімпіяда ж яшчэ не закончылася.

Алесь СІВЫ.

СКАНДАЛ

100 тысяч долларов наличными

Именно столько потребовал государственный антикризисный управляющий за прекращение проверки фирмы.

Расследованием дела занимается Следственный комитет.

“Установлено, что подозреваемый использовал полученную информацию о ходе процедуры ликвидации юридического лица и возможных правовых последствиях несоблюдения закона при ее проведении, — сообщает пресс-служба Следственного комитета. — *Антикризисный управляющий сообщил заинтересованным лицам, что по результатам проводимой Могилевским областным территориальным отделом по санации и банкротству Министерства экономики проверки может быть признана недействительной сделка по передаче части имущества ликвидируемого общества в собственность другого юридического лица. Под предлогом решения вопроса о прекращении данной проверки подозреваемый склонил заинтересованных лиц к даче взятки в сумме 100 тысяч долларов США должностным лицам вышеуказанного отдела”.*

Антикризисному управляющему успели передать только часть денег — 30 тысяч долларов. Сразу после этого его задержали представители КГБ.

Горе-бизнесмену предъявили обвинение в подстрекательстве к даче взятки в крупном размере. Сейчас он находится под стражей.

Кстати, 100 тысяч долларов — не самая большая взятка, которая в последнее время фигурировала в “коррупционной летописи” Беларуси. Так, экс-председатель “Белкоопсоюза” **Сергей Сидько** и его подчиненные вымогали 500 тысяч долларов. До суда это дело пока не дошло, расследованием занимается КГБ. А бывший первый заместитель председателя Мингорисполкома **Игорь Васильев** за взятку в 250 тысяч долларов был приговорен к 14 годам лишения свободы.

Спрашивается: откуда такие аппетиты?

Марина ВИШНЕВСКАЯ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
14 ЛЮТАГА 2014 г.

ЭКСПЕРЫМЕНТ

Чужым не месца...

*У Выбарчым кодэксе прама сказана: палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні, працоўныя калектывы, а таксама грамадзяне могуць вылучаць у тэрытарыяльную, акруговую, участковую камісію **толькі па адным прадстаўніку**. Лагічна? Так. А на справе?*

"Народная Воля" вырашыла прааналізаваць склад некалькіх камісій, створаных у сталіцы для правядзення мясцовых выбараў. Прычым юрысты нас папярэдзілі, што для чысціні эксперымента склад выбаркамаў, якія будуць працаваць у медыцынскіх установах (бальніцах), улічваць не трэба. Справа ў тым, што, згодна з нашым заканадаўствам, якраз у такіх камісіях (а таксама ў камісіях, створаных пры пасольствах) калегі па працы могуць разам лічыць галасы.

Такім чынам...



Настаўнікі вучаць асабістым прыкладам

Ленінскі раён сталіцы. Участковая выбарчая камісія №5

Склад камісіі афіцыйна выглядае так:

Кушнярэвіч Ніна Сцяпанаўна — ад калектыву дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа №123 г. Мінска".

Шатэрнік Раіса Мікалаеўна — ад Ленінскай раённай арганізацыі Камуністычнай партыі Беларусі.

Ільінкова Вольга Іванаўна — ад Ленінскай раённай арганізацыі Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Белая Русь".

Багданава Людміла Валянцінаўна — ад Ленінскай раённай г.Мінска арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі.

Якубеня Таццяна Іванаўна — ад Ленінскай раённай арганізацыі г.Мінска грамадскага аб'яднання "Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў".

Сыцько Алена Валянцінаўна — ад грамадзян шляхам падачы заявы.

Мінкевіч Іна Міхайлаўна — ад Ленінскай раённай арганізацыі г.Мінска грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз жанчын".

Мусіловіч Святлана Уладзіміраўна — ад Ленінскай раённай арганізацыі г.Мінска Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа.

Дуліна Тамара Віктараўна — ад Ленінскай раённай арганізацыі ветэранаў Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў.

Цярлецкая Людміла Сцяпанаўна — ад Мінскай гарадской арганізацыі Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці.

Шчарбінская Таццяна Васільеўна — ад Мінскай гарадской арганізацыі Беларускай сацыяльна-спартыўнай партыі.

Трафімчук Георгій Мікалаевіч — ад Ленінскай раённай арганізацыі Беларускага саюза афіцэраў.

Лыскавец Міхаіл Аляксандравіч — ад Мінскай гарадской арганізацыі Беларускай аграрнай партыі.

Месца знаходжання ўчастковай выбарчай камісіі: г.Мінск, пр.Ракасоўскага, 127а , ДУА "Сярэдняя школа №123 г.Мінска", тэл. 214-99-38.

На першы погляд патрабаванне закона выканана. У спісе нібыта прадстаўнікі розных структур і працоўных калектываў. Але больш уважлівае вывучэнне спіса дае іншы вынік.

Як высветлілася, **Ніна Кушнярэвіч** працуе дырэктарам мінскай СШ №123.

Ці ёсць пры дырэктары завучы?

А як жа! **Таццяна Якубеня** штодня працуе ў гэтай жа школе намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце. У спісе выбарчай камісіі яна, праўда, фігуруе як прадстаўніца грамадскай арганізацыі шматдзетных бацькоў. Яшчэ адзін завуч школы — па навучальнай рабоце — **Святлана Мусіловіч.** Аказваецца, і яна ёсць у складзе выбаркама. Толькі, калі глядзець на афіцыйны спіс, яна нібыта прадстаўляе Чырвоны Крыж.

Мы "ідэнтыфікавалі" як мінімум сем працаўнікоў СШ №123 у складзе адной камісіі. Прадстаўніца кампартыі Раіса Шатэрнік і сацыяльна-спартыўнай партыі Таццяна Шчарбінская з'яўляюцца настаўніцамі малодшых класаў, прадстаўніца Партыі працы і справядлівасці Людміла Цярлецкая — педагогам па харэаграфіі. Хто б мог падумаць, што ў школе такі "палітычны плюралізм"!

Вылучэнка прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Людміла Багданава па-за выбарамі — сацыяльны педагог гэтай школы, а прадстаўніца Саюза жанчын Іна Мінкевіч — настаўніца гісторыі...

І не забывайцеся: пройдуць выбары — і гэтыя людзі па-ранейшаму будуць вучыць нашых дзяцей, як пражыць так, каб не сорамна было...

Начальства забяспечыць вынікі

Заводскі раён сталіцы, выбарчая камісія №6.

Тут наяўнасць прадстаўнікоў аднаго працоўнага калектыву адразу кідаецца ў вочы.

Афіцыйны спіс складу камісіі выглядае так:

Бакштаева Людміла Леанідаўна — ад калектываў юрыдычнага аддзела і бухгалтэрыі камунальнага ўнітарнага даччынага прадпрыемства "Упраўленне капітальнага будаўніцтва Заводскага раёна г.Мінска".

Гаўрыловіч Наталля Паўлаўна — ад Заводскай раённай арганізацыі г.Мінска грамадскага аб'яднання "Беларускі фонд міру".

Драздова Кацярына Віктараўна — ад Заводскага раённага камітэта грамадскага аб'яднання "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі".

Івашын Кірыл Леанідавіч — ад Мінскай гарадской арганізацыі Беларускай аграрнай партыі.

Кацуба Віктар Якаўлевіч — ад грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз афіцэраў" Заводскага раёна г.Мінска.

Любатынскі Генадзь Іванавіч — ад Заводскай раённай арганізацыі г.Мінска Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Белая Русь".

Мікульчык Дзіяна Аляксандраўна — ад калектываў аддзелаў передпраектнай падрыхтоўкі і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння УКБ Заводскага раёна г.Мінска.

Ніціеўская Наталля Уладзіміраўна — ад калектыву аддзела паслуг УКБ Заводскага раёна г.Мінска.

Навакові Юрый Аляксандравіч — ад Заводскай раённай арганізацыі г.Мінска грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане" .

Сяргеева Таццяна Валянцінаўна — ад Заводскай раённай арганізацыі г.Мінска Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа.

Скорыкаў Сяргей Мікалаевіч — ад калектыву аддзела тэхнічнага нагляду, каштарысна-дагаворнага аддзела УКБ Заводскага раёна г.Мінска.

Сакалоўская Таццяна Генадзьеўна — ад Мінскай гарадской арганізацыі Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці.

Шчамялёў Дзмітрый Мікалаевіч — ад Мінскай гарадской арганізацыі Беларускай сацыяльна-спартыўнай партыі.

Ятчэня Наталля Васільеўна — ад Заводскай раённай арганізацыі г.Мінска грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз жанчын" .

Месца знаходжання камісіі: г.Мінск, вул.Ілімская, 9, ДУА "Сярэдняя школа №169 г.Мінска", тэл. 242-81-15.

Адразу са спіса бачна, што чатыры чалавекі на чале з галоўным эканамістам **Людмілай Бакштаевай** прадстаўляюць Упраўленне капітальнага будаўніцтва.

Але пад нумарам пяць у гэты спіс смела можна дадаваць вылучэнца "Белай Русі" **Генадзя Любатынскага,** бо за шыльдай грамадскай арганізацыі схаваўся намеснік дырэктара па эканоміцы.

Пад нумарам шэсць — вылучэнка БРСМ **Кацярына Драздова,** якая з'яўляецца начальнікам юрыдычнага аддзела.

Сёмы з калег — прадстаўнік Саюза афіцэраў **Віктар Кацуба,** больш вядомы як начальнік аддзела матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, восьмы — вылучэнец арганізацыі ветэранаў-афганцаў **Юрый Навакові,** ён жа — начальнік аддзела паслуг усё таго ж Упраўлення капітальнага будаўніцтва Заводскага раёна.

Адным словам, і размовы не можа ісці пра тое, што гэтая выбарчая камісія сфарміравана з прадстаўнікоў розных працоўных калектываў. Галасы будуць лічыць не проста прадстаўнікі адной арганізацыі, а прадстаўнікі кіраўніцтва адной арганізацыі.

> ***...А значыць, прынцып Сталіна па-ранейшаму знаходзіцца на ўзбраенні беларускага кіраўніцтва: не важна, як людзі прагаласуюць, важна — хто і як будзе лічыць галасы...***

Знаёміцца не трэба

Ну, і трэцяя камісія, спіс складу якой трапіў нам на вочы, — №3 Цэнтральнага раёна Мінска.

Адразу звяртае на сябе ўвагу тое, што ў ёй няма не толькі прадстаўнікоў апазіцыі, але і прадстаўнікоў простых грамадзян. Камісія складзена з вылучэнцаў самых розных арганізацый, па большасці — дэкаратыўных, якія дэманструюць масавасць сваіх радоў толькі падчас выбараў і толькі ў якасці пастаўшчыкоў членаў выбаркамаў.

Спісачны склад гэтай камісіі такі:

Аўруцін Сяргей Юльевіч — ад Мінскай гарадской арганізацыі Беларускай сацыяльна-спартыўнай партыі.

Гаральчук Алена Уладзіміраўна — ад працоўнага калектыву кафедры плавання ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры".

Дранкевич Вольга Георгіеўна — ад Цэнтральнай раённай арганізацыі г.Мінска Камуністычнай партыі Беларусі.

Дыбоўская Алена Іванаўна — ад Цэнтральнай раённай арганізацыі г.Мінска Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа.

Жывіца Алеся Вячаславаўна — ад Цэнтральнай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі".

Зайцава Алена Фёдараўна — ад Цэнтральнай раённай арганізацыі г.Мінска Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Белая Русь".

Кастэнка Ірына Анатольеўна — ад Цэнтральнай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання "Беларускі фонд міру".

Кротаў Аляксандр Леанідавіч — ад Мінскай гарадской арганізацыі Рэспубліканскай партыі.

Рабкоў Аляксандр Іванавіч — ад Цэнтральнай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз афіцэраў".

Саламаціна Ірына Леанідаўна — ад Цэнтральнай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз жанчын".

Слішына Таццяна Леанідаўна — ад Мінскай гарадской арганізацыі Беларускай аграрнай партыі.

Месца знаходжання камісіі: г.Мінск, вул.Вясёлкавая, 8, к.3, ДУА "Сярэдняя школа №180 г.Мінска", тэл. 250-10-50.

Аднак і гэты спіс можна скласці па-іншаму. І тады выглядаць ён будзе так: загадчык кафедры, начальнік вучэбна-метадычнага аддзела, старшыня прафкама студэнтаў, старшы выкладчык, старшы выкладчык, старшы выкладчык... Іншымі словамі, і ў гэтай камісіі аказалася *"шырокае прадстаўніцтва",* але толькі адной арганізацыі — Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры.

Нашы высновы

Афіцыйныя спісы складу выбарчых камісій хаваюць вялікі падман. Вонкавае шырокае прадстаўніцтва палітычных сіл, грамадскіх арганізацый і працоўных калектываў — гэта ілюзія, якая разбураецца пры больш глыбокім вывучэнні складу камісій. На самай справе ў іх па-ранейшаму будуць засядаць людзі, якія добра ведаюць адзін аднаго і залежаць адзін ад аднаго па асноўным месцы працы. А значыць, прынцып Сталіна па-ранейшаму знаходзіцца на ўзбраенні беларускага кіраўніцтва: *не важна, як людзі прагаласуюць, важна — хто і як будзе лічыць галасы...*

Алена НОВІКАВА.

ПРАБЛЕМА

Тайны жыровак

*Чаму ў Беларусі сабекошт жыллёва-камунальных паслуг дагнаў і перагнаў еўрапейскія паказчыкі? Гэта толькі адно з пытанняў, на якія павінна даць адказ працоўная група па вывучэнні праблемных пытанняў ЖКГ, створаная пад кіраўніцтвам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю **Аляксандра Якабсона.***

Ужо на першым яе пасяджэнні былі абнародаваны сенсацыйныя звесткі, якія часткова тлумачаць, чаму, калі ўвесці 100-працэнтную аплату паслуг ЖКГ насельніцтвам, мы будзем вымушаны плаціць за іх больш, чым еўрапейцы. Аказваецца, пры разліку тарыфаў камунальшчыкі ўкладваюць у іх усе свае праблемы. У адным рэгіёне — стратную мэблевую фабрыку, у другім — прадпрыемствы бытавога абслугоўвання, у трэцім — завод хімічнага мелу... Пералік банкрутаў, за якіх мы чамусьці павінны плаціць як за вываз смецця ці мыццё пад'езда, склаў ажно пяць лістоў. Таму зусім не дзіўна, што ў выніку атрымліваюцца астранамічныя лічбы.

Група пад кіраўніцтвам Аляксандра Якабсона толькі пачала сваю працу, і, думаецца, яе чакае яшчэ шмат "адкрыццяў".

Ігар МАРОЗАЎ.

ПАДЛІЧЫЛІ

Багатыя багацеюць...

У мінулым годзе ў параўнанні з 2012-м попыт на дыяменты сярод беларусаў узрос на 300 працэнтаў.

З такімі тэмпамі каштоўныя камяні хутка перасягнуць рэйтынг самых папулярных падарункаў — парфумерыю і касметыку.

Пры гэтым цэны на ўнутраным рынку на дыямент у пятую частку карата вагаюцца ад 500 да 1000 долараў.

ЧУЛІ?

Скандал у БНТУ

Кіраўнік кафедры адной з вядучых ВНУ краіны папаўся на хабары

Упраўленнем Следчага камітэта па Мінску распачаты крымінальныя справы ў дачыненні да кіраўніка кафедры і двух выкладчыкаў БНТУ.

"Дзеянні падазроных кваліфікаваны па ч.1 арт.430 (атрыманне хабару)", — паведамілі ў аддзеле інфармацыі і сувязі з грамадскасцю СК Беларусі.

Устаноўлена, што падазроныя прынялі незаконныя грашовыя ўзнагароды ў замежнай валюце за спрыяльнае рашэнне пытанняў, звязаных са здачай іспытаў і курсавога праекта.

ПАМЯЦЬ

Мая КРАПІВІНА, вязень мінскага гета:

«Мемарыял у Трасцянцы патрэбны, каб было дзе паплакаць над памерлымі»

Беларусы, якія перажылі вайну, заклікаюць еўрапейцаў далучыцца да ўзвядзення мемарыяльнага комплексу на месцы былога лагера смерці.



Мая Крапівіна.

Параднiлiся ў смерці

Гісторыі **Маі Крапівінай, Фрыды Рэйзман, Аляксандры Барысавай, Сімы Марголінай** і **Міхаіла Трэсцера** адначасова падобныя і зусім розныя. Гэтыя людзі ў гады вайны спазналі страшныя пакуты ў гета, канцлагерах, падчас цяжкай працы на чужыне. Пры падтрымцы Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра імя Ёханеса Рау жывыя сведкі жахаў вайны накіраваліся ў тыя гарады, жыхары якіх былі вывезены на смерць у Беларусь. Як заўважыла **Аляксандра Барысава**, якая перажыла катаванні і медыцынскія вопыты ў канцлагерах Майданек і Асвенцым, на сустрэчу з нямецкай моладдзю, палітыкамі і журналістамі яна пагадзілася *"не для таго, каб нас пашкадавалі, а каб усё тое, што мы перажылі, не паўтарылася"*.

Для кожнага з удзельнікаў паездкі ў Нямеччыну стварэнне мемарыяла мае асаблівае значэнне. Вязень мінскага гета **Мая Крапівіна** лічыць, што для многіх гэтае месца стане сямейнымі могілкамі.

"*За час існавання мінскага гета з маёй сям'і знішчылі 50 чалавек,* — узгадвае жанчына. — *Маці маю павесілі на Юбілейнай плошчы, а маленькую сястру задушылі... Матуля тры дні вісела, яе цела не давалі зняць. Многія сваякі забітых у гета дагэтуль не ведаюць, куды забіралі целы — скідвалі ў Яму ці спальвалі ў Трасцянцы. Нам патрэбны мемарыял, каб было дзе паплакаць над памерлымі"*.



Сіма Марголіна дакладна ведае, што яе забітых сваякоў пахавалі ў Трасцянцы. Там жа, дзе былі знішчаны целы соцень яўрэяў, якіх вывезлі з Еўропы.

"Мая сям'я ў смерці параднілася з гамбургскімі яўрэямі", — уздыхае Сіма Міхайлаўна.

У лагеры смерці "Трасцянец" забівалі не толькі яўрэяў з Беларусі і Еўропы. З-за адсутнасці дакументаў немагчыма падлічыць, колькі ваеннапалонных, партызан, падпольшчыкаў і простых беларусаў было знішчана ў гэтым страшным месцы. Мемарыял павінен увекавечыць памяць кожнага, хто загінуў у фашысцкім лагеры смерці.

Моладзь перакармілі вайной?

"Для немцаў пабудова мемарыяла — толькі першы крок, прычым не абавязкова галоўны", — адзначыў дырэктар Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра імя Ёханеса Рау **Віктар Балакіраў**. Паводле ягоных слоў, галоўная мэта праекта — стварыць на базе мемарыяла інфармацыйны цэнтр, дзе жывыя сведкі тых жудасных падзей ды прафесійныя гісторыкі змогуць дзяліцца ведамі з маладым пакаленнем. Без гэтага працу па стварэнні комплексу можна лічыць марнай.

"Безумоўна, нам хацелася б, каб з часам мемарыял набыў статус нацыянальнага, — падзялілася планамі дырэктар цэнтра імя Ёханеса Рау **Вольга Рэнш-Ветцэль**. — *У Хатынскім комплексе ёсць невялічкі інфармацыйны цэнтр, які дазваляе весці працу з моладдзю. Нам хацелася б таго ж"*.

Аб неабходнасці працы з юным пакаленнем казаў кожны, датычны да справы ўзвядзення мемарыяла ў Трасцянцы.

"*Нямецкая моладзь да тэмы вайны ставіцца з большай увагай, чым беларуская або яўрэйская,* — адзначыў былы вязень мінскага гета, партызан **Міхаіл Трэсцер**. — *Ствараецца ўражанне, што наша моладзь трохі перакормлена гэтай тэматыкай, таму трэба шукаць нейкія новыя, цікавыя падыходы"*.

Адказваючы на пытанне "Народнай Волі" аб тым, хто ў будучым будзе сачыць за мемарыялам, спадар Балакіраў адзначыў, што пакуль усю адказнасць на сябе бярэ Мінгарвыканкам. Менавіта горад выдаткаваў грошы на праект і прапанаваў аб'яднаць помнікі ў Трасцянцы і Благаўшчыне.

АБ ЧЫМ РАЗМОВА?

Болевыя кропкі

Сёння былога лагера смерці "Трасцянец" практычна няма на карце памяці еўрапейцаў. Не стала гэтая палітая крывёю зямля і месцам пакланення для беларусаў. Мінск, на ўскрайку якога калісьці знаходзілася гэтае месца гібелі многіх тысяч людзей, амаль паглынуў тэрыторыю былога канцлагера. Літаральна насупраць старой лагернай брамы ўзрастаюць навабуды, а месца, дзе, паводле самых сціплых падлікаў, загінулі каля двухсот тысяч чалавек, мяжуе са звалкай.

Праз 70 гадоў пасля вызвалення Беларусі было прынята рашэнне ўшанаваць памяць тых, хто быў бязвінна забіты ў лагеры смерці. На тэрыторыі амаль у 100 гектараў вырашылі стварыць мемарыяльны комплекс. Яго распрацоўкай заняліся спецыялісты "Мінскпраекта". Памятныя знакі павінны былі з'явіцца на месцы крэматорыя ў Шашкоўцы і хлява ў былым маёнтку Трасцянец, дзе 28 чэрвеня 1944 года забілі ад двух да шасці тысяч чалавек.

У мінулым годзе знакаміты архітэктар **Леанід Левін** разам са сваімі калегамі прапанаваў праект мемарыяла, які мусіць з'явіцца ва ўрочышчы Благаўшчына, у якім разам з савецкімі грамадзянамі былі знішчаны яўрэі з Германіі, Аўстрыі і Чэхіі і якое не ўвайшло ў першапачатковы план "Мінскпраекта". Прафінансаваць гэтую частку ўзяўся Дортмундскі міжнародны адукацыйны цэнтр, які ініцыяваў збор грошай у Германіі, Аўстрыі, Чэхіі. Паводле падлікаў, на будаўніцтва патрэбна каля **двух мільёнаў еўра,** і частка з гэтай агромністай сумы ўжо знойдзена. Ініцыятары будаўніцтва спадзяюцца, што астатнюю частку грошай дапаможа знайсці нямецкае Міністэрства замежных спраў.

З красавіка 1942 года па чэрвень 1944-га ў лагеры смерці "Трасцянец" было знішчана каля 206 тысяч чалавек. Дакладная лічба забітых дагэтуль невядомая.

Марыя МАЛЕВІЧ.

ГУЧНАЯ СПРАВА

З прысудам не пагадзіліся

Усе фігуранты па справе аб гібелі пацыенткі "Экамедсэрвіса" Юліі Кубаравай падалі касацыйныя скаргі на прысуд суда першай інстанцыі.

Як вядома, былы гендырэктар цэнтра Галіна Валжанкіна была асуджана на 2 гады абмежавання волі без накіравання ў папраўчыя ўстановы закрытага тыпу. Былы галоўны інжынер "Экамедсэрвіса" Вадзім Ліхута — на 3 гады пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ва ўмовах калоніі-пасялення.

Самы жорсткі прысуд па гэтай справе быў вынесены ў дачыненні да былога анестэзіёлага "Экамедсэрвіса" Аляксандра Шурава — 4 гады пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ва ўмовах калоніі-пасялення. Акрамя таго, яго пазбавілі права займацца урачэбнай дзейнасцю на пяць гадоў.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Валянцін СТЭФАНОВІЧ:

«Поўны суб'ектывізм пры фарміраванні ўчастковых камісій!»

*Участковыя выбарчыя камісіі для работы на мясцовых выбарах сфарміраваны, аднак незалежныя эксперты па выніках назірання адзначаюць "закрытасць працэсу". Аб гэтым наш карэспандэнт гутарыць з праваабаронцам **Валянцінам СТЭФАНОВІЧАМ.***

По звестках Цэнтрвыбаркама, у склад участковых выбарчых камісій, сфарміраваных для работы на мясцовых выбарах, уключаны 23 прадстаўнікі чатырох апазіцыйных партый, у той час як усяго яны вылучалі 372 чалавек.

Як паведаміў сакратар Цэнтрвыбаркама **Мікалай Лазавік**, колькасць уключаных ва ўчастковыя камісіі прадстаўнікоў апазіцыйных партый знізілася ў параўнанні з папярэднімі выбарамі.

— Актыўнасць апазіцыйных партый на самай справе зменшылася, — канстатуе **Валянцін СТЭФАНОВІЧ.** — Іншая справа, што з тых, каго вылучылі, у склад камісій увайшоў мізэрны працэнт. Для прыкладу, ад праўладных партый у камісіі ўвайшлі 86 працэнтаў. Так што можна параўнаць і зрабіць высновы пра падыходы выканкамаў пры фарміраванні ўчастковых выбарчых камісій. Прадстаўнікам апазіцыі пераважна адмаўлялі. І галоўная праблема, якая існуе не першыя выбары, тое, што няма крытэрыяў у заканадаўстве для ўключэння кандыдатаў у склад камісій. Тут поўны суб'ектывізм. Кожны ў лепшым выпадку выдумляе нешта сваё, а ў горшым — наогул нічога не выдумляе, таму што закон не абавязвае трымаць справаздачу, чаму ўзялі ў камісію таго, а не іншага.

— Ці можа кандыдат, якога не ўключылі ў камісію, абскардзіць рашэнне ў судзе?

— Можа, але гэта бессэнсоўна. У выніку мы бачым, што застаецца "цудоўная пяцёрка" — пяць найбуйнейшых у краіне праўладных няўрадавых арганізацый, з якіх у асноўным і фарміраваліся ўчастковыя камісіі: Федэрацыя прафсаюзаў, "Белая Русь", БРСМ, Беларускі саюз жанчын і Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў. Гэта яскрава сведчыць, як выбудавана ў нас палітычная сістэма. Атрымліваецца наогул, што палітычныя партыі (апазіцыйныя ці праўладныя) іграюць вельмі малую ролю ў палітычным працэсе. Ад партый ва ўчастковыя камісіі вылучана толькі 4 працэнты. Хаця на першы погляд менавіта партыі павінны быць асноўнымі палітычнымі суб'ектамі падчас выбараў. Затое грамадскія аб'яднанні чамусьці ў нас з'яўляюцца наперадзе ўсіх. Такая вось спецыфіка.

— Назіральнікі адзначаюць закрытасць пры фарміраванні камісій. Гэта так?

— Нашы назіральнікі спрабавалі прысутнічаць на пасяджэннях органаў, якія фарміравалі камісіі. Пры гэтым мы спасылаліся на закон "Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні", а ён дазваляе прадстаўнікам арганізацый і грамадзянам такую прысутнасць. На жаль, многім нашым прадстаўнікам такі дазвол не далі. А тыя, хто прысутнічаў, паведамілі, што пры фарміраванні камісій не абмяркоўваліся кандыдатуры, а проста зачытваўся спіс. У некаторых выпадках нават прозвішчы не называліся.

— Адным словам, усё застаецца па-ранейшаму...

— Нічога не змяняецца. Фігуры ў камісіях застаюцца ранейшыя, назіральнікі сведчаць, што фактычна гэта тыя самыя людзі, якія бралі ўдзел у выбарчай кампаніі на апошніх парламенцкіх выбарах. І вытворчы прынцып фарміравання камісій застаецца стары. Тыя людзі, якія патрапілі ў камісіі, залежныя не толькі ад улад, але і ад свайго працоўнага кіраўніцтва. А большасць з іх працуюць па кароткатэрміновых кантрактах. Пры гэтым заканадаўства так сфармулявана, што няма патрабаванняў указання месца працы сябраў камісій, хоць закон утрымлівае забарону на ўключэнне ў камісіі прадстаўнікоў кіруючых органаў выканаўчай улады. А як праверыць, дзе чалавек працуе, калі не ўказваецца месца работы? Я лічу, што гэта робіцца знарок, каб схаваць вытворчы прынцып фарміравання камісій.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
14 ЛЮТАГА 2014 г.

ЗАДУМАЕМСЯ...



Цена Победы

Приближается большая дата — 70-летие Победы над фашизмом.

Так все-таки ценой скольких человеческих жизней досталась победа? Когда-то в исторической литературе назывались разные цифры — от 7 миллионов человек до 10—12, без учета жертв среди гражданского населения. И наконец в 1990-х годах стали говорить о 30 миллионах, но уже и с теми людьми, которые не воевали, но погибли по причине войны.

Кому нужно было скрывать правду о численных потерях воинов, сложивших свои головы на полях сражений, погибших в плену, умерших от ран в госпиталях? Партийно-политическая пропаганда делала все возможное, чтобы оправдать трагическое положение Красной Армии в 1941—1942 годах. Я прочитал много мемуаров — воспоминаний командующих фронтами, армиями, дивизиями, руководителей партизанских соединений. В большинстве своем они отражают потери противника в численности, а также в технике и другом вооружении. И только единицы рассказывают о начале войны 1941 года более-менее правдиво, не называя виновников этой трагедии. Да это и понятно. До 1985 года Красная Армия считалась непобедимой и легендарной, а ее руководство — “народными полководцами”.

Взяться за написание этой статьи и ознакомить молодое поколение нашей страны с трагическими итогами прошедшей войны меня побудила книга Бориса Соколова “Цена победы (Великая Отечественная: неизвестное об известном)”. Автор продолжительное время изучал документы, находящиеся в архиве Министерства обороны Российской Федерации в г.Подольске Московской области, что позволило положить в основу книги достоверные источники.

Основная цель Б.Соколова: аргументированно доказать, что историческая победа советского народа в войне была достигнута неоправданно огромной ценой миллионов жизней наших соотечественников.

Преклоняясь перед жертвами, исследователь остро ставит проблему: почему же победа стала возможной только с такими колоссальными потерями? И вполне обоснованно делает вывод, что ответственность ложится на тогдашний общественный строй СССР, выражающийся в сталинской тоталитарной системе, фундаментальными чертами которой были циничное презрение к человеческой жизни, всеобщий страх и подавление инициативы.

Теперь потери советских Вооруженных Сил надежно установлены — 8,5 млн убитых, 2,5 млн умерших от ран и болезней, 3,7 млн скончавшихся в плену. Всего погибло 14,7 млн военнослужащих. Запомним эту цифру. Истина пугала Сталина и его окружение, стремившихся скрыть свою ответственность за плохую подготовку к войне, драматические просчеты и огромные, ничем не оправданные военные потери.

Только полная правда о той страшной войне поможет реально понять нас тогдашних и по-новому взглянуть на нас сегодняшних.

Возьмем такой фрагмент. Историки представили более точную цифру — 5,7 млн советских военнопленных, погибло примерно 3,7 млн человек, из них почти 2 млн пленных умерли в первый год войны в армейских лагерях на советской территории.

Вдумайтесь, дорогие читатели: 5,7 миллиона пленных! А ведь это мужчины в возрасте от 19 до 40 лет. Цвет нации! Многие из них не были женаты, не имели семей.

Основной поток военнопленных советских солдат припадает на 1941—1942 годы, на самое критическое, трагическое время.

...Западный фронт попадает в окружение в июне-июле 1941 года под Минском, в октябре — под Вязьмой, Юго-западный фронт тоже дважды был в окружении — в сентябре 1941 года под Киевом, в мае 1942 года под Харьковом (Барвенково).

К тому же уже в феврале-марте 1941 года 33-я Армия генерала Ефремова под Вязьмой частично уничтожена, частично пленена. Разгром советских войск в Крыму в мае-июне 1942 года, где были пленены около миллиона наших солдат. В июне-августе 1942 года гибель Второй ударной армии под Волховом (Синявские болота). А сколько советских воинов полегло подо Ржевом, на “Невском пятачке”. Об этом, видимо, никто никогда не узнает.

В течение 1941—1944 годов в плен к немцам попали 83 генерала Красной Армии, из них 7 командующих армиями, 19 командиров корпусов, 31 командир дивизии, 4 начальника штабов армий, 9 начальников родов войск армий.

По времени попадания в плен это выглядит так: 1941 год — 63 человека, 1942-й — 16, 1943-й — 3, 1944 год — 1 человек.

Эти генералы содержались в немецких лагерях почти в таком же режиме, что и остальные советские военнопленные. Незначительное количество из них перешло на службу к немцам (во главе с генералом Власовым), впоследствии они были осуждены и казнены.

Для сравнительной оценки уточним, сколько погибло немецких солдат и сколько попало в плен к нашим войскам.

Итоговые потери немецкой армии за всю войну определяются в 3,2 млн убитыми и умершими от ран и в 2 млн пленных. Правда, в процессе массовой капитуляции немцев в 1945 году (фактически это большая часть немецкой армии) в плен было взято около 7,6 млн человек.

Велики были потери и мирного населения Германии — около 2 млн человек.

Согласно данным на 1 января 1941 года население СССР насчитывало 196,6 млн человек, а на начало 1946 года — всего 167 млн человек. Чистая убыль населения составила 29,6 млн человек.

При подсчете общих потерь в годы войны Б.Соколовым проведены большие исследования по категориям потерь, а также учтены потери в лагерях ГУЛАГа, где умерли и были расстреляны около 611 тысяч человек в 1941—1945 годах. Учтены также снижение рождаемости, смертность населения от ужасных условий холода и голода. В результате общая численность гибели мирного населения составляет около 15 млн человек. Таким образом, Великая Отечественная война унесла около 30 млн военнослужащих и гражданского населения.

Апологеты сталинизма продолжают утверждать: без этого не было бы Победы. Я же считаю, что жертв могло быть намного меньше, будь другой политическая система СССР, не будь в стране тоталитарного режима. Только не так давно стало известно о сотрудничестве СССР с Германией. Так, начиная с 1923—1932 гг. на многих предприятиях Советского Союза скрытно были размещены германские военные заказы. В нашей общей стране на немецком оборудовании и с помощью немецких специалистов строились танки, самолеты, артиллерийские орудия. Германские военнослужащие овладевали боевой техникой на советских полигонах и аэродромах, недоступных контролю версальской системы. Несомненно, благодаря немецкой помощи, СССР смог сравнительно быстро обеспечить Вооруженные Силы современной боевой техникой, перевооружив военную промышленность необходимым оборудованием. Но и Германия значительно усилила свой военный потенциал, в результате чего Гитлер в очень короткий срок смог воссоздать массовую армию, располагая и необходимой техникой, и подготовленными кадрами. Эта армия и пошла войной на СССР 22 июня 1941 года.

Скажите, пожалуйста, кому был нужен парад войск в честь так называемой победы над Польшей в Бресте в сентябре 1939 года, когда войска Красной Армии и фашистской Германии прошли по улицам Бреста торжественным маршем? Это напоминало пир во время чумы. Все это продолжительное время скрывалось от народа. Почему? Догадаться нетрудно.

Возникает справедливый вопрос: как могло случиться, что немецкая армия дошла до Сталинграда?

Вопрос непростой. Многие бывшие военачальники пытались объяснить это, в основном ссылаясь на внезапность нападения, значительное превосходство численности военнослужащих немцев, большее количество танков и самолетов.

